


# «1,10

## Спадчына Малевіча

**Рэспубліканская выстава «1,10 квадрата», прымеркаваная да 110-годдзя «Чорнага квадрата» Казіміра Малевіча, адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі.**

Экспазіцыя арганізавана сумесна з Беларускім саюзам мастакоў. Гледачам прадстаўлены разнастайныя творы віцебскіх мастакоў, натхнёныя як творчасцю Казіміра Малевіча, так і ўвогуле супрэматызмам. Трэба адзначыць, што гэта першая выстаўка агульнага аднайменнага праекта, які будзе праходзіць на працягу года на розных выставачных пляцоўках Беларусі.

— Думаю, у Віцебску кожны мастак лічыць сябе абавязаным хоць

# КВАДРАТА»

## ў сучасным мастацтве

адну працу ў сваім жыцці прысвяціць Казіміру Малевічу, бо гэта горад, у якім практычна нарадзіліся Парыжская школа і супрэматызм, — распавядае **першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў, мастацтвазнаўца Наталля ШАРАНГОВІЧ.** — Мне здаецца, што прыцягальнасць авангарда таго часу застаецца і сёння. Мы спрабуем трансфармаваць авангард і паказаць, што ў пэўны момант часу «Чорны квадрат» прарваў мастацтва і даў зразумець: погляд на яго можа быць іншым. Праз піксель, кропку ці экран можна зусім па-іншаму ўспрымаць свет.

Паводле яе слоў, на выставе прадстаўлены аўтары розных стыляў і пакаленняў, але кожны з іх, з аднаго боку, робіць сваё мастацтва эмацыянальным, а з другога — вельмі філасофскім. Напрыклад, на выставе прадстаўлены дыптых «Цырк. Сланы ідуць на прышчэпку» Валянціны Ляховіч. Мастачцы 78 гадоў, але яна да гэтага часу не проста працуе, але сапраўды займаецца актуальным мастацтвам. Сярод усіх карцін вельмі вылучаліся сваёй унікальнасцю творы маладой мастачкі Віялеты Някрасавай, выкананыя ў аўтарскай тэхніцы. Гэта неверагоднае спалучэнне тэкстылю, фарбаў і творчай ідэі. Таксама на выставе можна ўбачыць і творы мастака-манументаліста Васіля Васільева, які піша не толькі вялікія манументальныя творы і стварае арт-аб'екты, але і з'яўляецца куратарам шматлікіх мерапрыемстваў, прысвечаных авангарднаму мастацтву.





У некаторых гледачоў можа ўзнікнуць пытанне да назвы выставы: чаму менавіта «1,10 квадрата»?

— Назва выставы вельмі канцэптуальная, як і яе змест. У ім можна ўбачыць алюзію на 110-гадовы юбілей, — тлумачыць загадчыца сектара мастацкіх выставак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вікторыя Харытонава. — Яшчэ «0,10» — гэта назва апошняй футурыстычнай выставы карцін, на якой у 1915 годзе Казімір Малевіч прадставіў свае абстрактныя работы і канцэпцыю супрэматызму.

Паводле яе слоў, нуль сімвалізуе адсутнасць форм, бо кірунак супрэматызму прадугледжваў знаёмства з жывапісам без увагі да контураў і аб'ёмаў твора. А «10» адсылае да дзесяці мастакоў, якія павінны былі ўдзельнічаць у выставе ў 1915 годзе. У выніку іх аказалася шэсць чалавек, але назву выставы пакінулі «0,10».

**Лізавета ГОЛАД,**
**фота аўтара.**